# Глінішча. Мележ...


Дырэктар музея С.П.Ліпніцкая.

Быць на Хойнiччыне i не завiтаць у вёску Глiнiшча, што за 20 кiламетраў ад Хойнiкаў, не пабываць у тутэйшым Доме-музеi народнага пiсьменнiка Беларусi I.П. Мележа — гэта быў бы грэх...

Вёска Глінішча, якая ў 2006 годзе атрымапа статус аграгарадка, па сутнасці, першы населены пункт Хойніцкага раёна па дарозе з Мазыра ў Хойнікі. Здалёк бачыш дарожны знак на першай жа развілцы — "Глінішча 1, Дом-музей імя І.П. Мележа" — і міжволі радуешся: значыць, яго заўважыш не толькі ты, абазнаны ў тым, хто такі І.П. Мележ і чым славутае Глінішча, але і сотні, тысячы іншых людзей, у тым ліку замежнікі, якія, магчыма, не ведаюць ці не памятаюць пра мележаўскую радзіму, але, праязджаючы гэтай дарогай, інстынктыўна звяртаюць увагу на паказальнік і ўспамінаюць альбо даведваюцца.

Вельмі многае ў Глінішчы само гаворыць пра Мележа. Імя Івана Паўлавіча тут носяць вуліца, вучэбна-педагагічны комплекс "дзіцячы сад — сярэдняя школа", кааператыўнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства (ранейшы калгас). Дарэчы, на КСУП імя І.П. Мележа працуе пераважная частка насельніцтва Глінішча: сюды ўваходзяць малочныя фермы, жывёлагадоўчы комплекс, аўтатрактарны парк. І наогул, у Глінішчы сёння створаны ўсе ўмовы для нармальнага жыцця. Ёсць бібліятэка, дом культуры, гандлёвы цэнтр, банк з банкаматам, кавярня "Беларускія прысмакі" (дзе апрача ўсяго можна пагуляць і ў більярд), пошта, не кажучы ўжо пра вышэйзгаданую навучальную ўстанову. Іван Паўлавіч, напэўна, парадаваўся б...

І пакуль я пра ўсё гэта думаю, набліжаючыся да Дома-музея пісьменніка, заўважаю здалёк бабулю ля прыгожай музейнай брамы — гэта Соф'я Піліпаўна Ліпніцкая, дырэктар установы, пляменніца Івана Паўлавіча па матчынай лініі. У яе твары адразу прасочваюцца рысы, падобныя да мележаўскіх.




Соф'я Піліпаўна тут жа ўводзіць мяне ў курс справы крыху ў афіцыйным стылі: "Вы знаходзіцеся на нашай глінішчанскай зямлі, дзе вытокі-карані "Палескай хронікі" Івана Паўлавіча Мележа. Тут, на гэтай зямлі, жылі, працавалі, кахалі, будавалі новае жыццё, змагаліся за чалавечае шчасце героі Мележа. І вось нашы землякі вырашылі ацаніць яго заслугі перад роднай зямлёй і аднавяскоўцамі. Неацэннай данінай памяці пра Івана Паўлавіча з'яўляецца якраз гэты Дом-музей, які быў пабудаваны ў 1983 годзе калгасам "Ленінскі шлях". Ніякіх бюджэтных сродкаў на будаўніцтва музея тады не было запланавана. Рашэннем Хойніцкага райкама партыі (сакратаром у той час быў Георгій Трафімавіч Карасевіч, які ведаў Івана Паўлавіча, неаднаразова сустракаўся з ім) лясгасу было даручана пастаўляць матэрыял, а нашы калгаснікі ўжо будавалі — народнай "будоўляй". Музей — гэта як бы помнік Мележу".

"Вам жа не трэба, напэўна, расказваць пра творчасць Івана Паўлавіча?" — асцярожна пытаецца ў мяне затым Соф'я Піліпаўна, і я адказваю, што не, не трэба. "Раскажыце лепш што-небудзь пра тое, што найбольш любяць слухаць школьнікі".

Я слухаю і ўяўляю, як цікава пачуць малым, напрыклад, пра тое, што калі будучаму пісьменніку было ўсяго тры гады, ён уцякаў за вёску і мог гадзінаміназіраць за ветраком. Або пра тое, як ужо ў пяць гадоў бегаў праз лес за пяць кіламетраў у Каранеўку (літаратурныя Курані) да дзеда Дзяніса (па маці), які быў незвычайным чалавекам — пчол трымаў, і на скрыпцы граў, і цудоўным казачнікам быў... Вядома ж, пяцігадоваму Івану было вельмі цікава з такім дзедам. Хаця і бацька Івана Паўлавіча — Павел Фёдаравіч — быў таксама не зломкам, а майстрам на ўсе рукі: сам рабіў дзежкі, бочкі, людзям вокны ўстаўляў. Амаль ва ўсіх Паўлаў (а іх у Глінішчы было шмат) меліся нейкія крыўдныя мянушкі: Павел Ламач, Павел Маслюк і г.д. А бацьку Івана інакш як Павел Галаваты за вочы ніхто і не называў. Куды пойдзеш? Да Паўла Галаватага. Чыя Тамара (дачка Паўла Фёдаравіча, сястра пісьменніка)? Канечне ж, Паўла Галаватага! І невыпадкова ў такога кемлівага бацькі быў такі ж

галаваты сын. Марыя Дзянісаўна, маці пісьменніка, расказвала. што ў дванаццаць гадоў Іван змайстраваў драўляны веласіпед. З рамай, коламі і спіцамі — усё як мае быць. Праўда, нядоўга ён паслужыў — уся мудрагелістая драўляная канструкцыя развалілася на часткі, як толькі Іван выехаў на вуліцу. Але ж зрабіў-такі! Сам, у дванаццаць гадоў!

Умее Соф'я Піліпаўна — расказаць цікава і пра рэчы, наўпрост звязаныя з "Палескай хронікай". Скажам, пра выдуманае і нявыдуманае ў рамане, пра герояў і іх прататыпаў: "Нічога ён не выдумляў. А як ён мог нешта выдумаць, калі нарадзіўся тут, жыў?! І тая цагельня на самай справе ёсць у Каранеўцы, і тое возера, дзе Хадоська ўтапіцца хацела, калі ішла да знахаркі. Праўда, яно ўжо амаль зарасло. Мы з карэспандэнтамі “Гомельскай праўды" туды нядаўна ездзілі — адны кусты... А што да герояў... Ну, вось кажуць, што яго цётка Ганна, якая жыла ў Каранеўцы, — гэта Ганна Чарнушка, прататып яе. Але гэта няпраўда. Можа, хіба крышачку ён ад яе ўзяў. Хутчэй, мая маці, Алеся Мележ, — прататып Ганны. Яна ж бацьку майго не любіла, ён яе прымусіў за яго пайсці — быў брыгадзірам, казаў, што як не пойдзе, дык ён яе бацькоў у Сібір сашле. Хаця наогул Ганна — гэта не рэальны, а такі абагульнены вобраз жанчыны-паляшучкі. Гэткіх, як яна, у нас у кожнай вёсцы было не па адной, і нават не па дзве... Але ж ёсць у "Палескай хроніцы" і цалкам рэальныя героі, напрыклад, Іван Зайчык (ён увесь час ганарыўся, што патрапіў на старонкі неўміручага твора), Лёша Касцючэнка (сусед Івана Паўлавіча, яго прозвішча ў рамане нават не зменена), Дамецікі (таксама суседзі), швачка Голда, якая шыла кофту Ганне на вяселле... Божа мой, дык яна ж і мне неаднаразова шыла сукенкі! Затым пераехала ў Мазыр жыць. У рамане яна — Голда, а на самай справе яе звалі Годля. А ці падобны нечым сам Іван Паўлавіч да Васіля Дзятла? Вось часта пра гэта чамусьці пытаюцца. Ну вядома ж, нешта пабраў Васіль ад свайго аўтара. Напрыклад, як сена касіў. Іван Паўлавіч жа таксама з бацькам ездзіў сена касіць ва ўрочышча Вішанькі. Але галоўным яны не былі падобныя. Іван Паўлавіч ніколі не быў такім сквапным, як Васіль. Наадварот, усяляк думаў пра іншых, асабліва пра сваіх аднавяскоўцаў. Узяць хоць бы тую ж цяперашнюю глінішчанскую школу. Яе ж усё ніяк не хацелі будаваць. І толькі калі Іван Паўлавіч паруліўся, схадзіў да каго трэба, справа скранулася з месца. А што Васіль? Каханне каханнем, а ўсё ж так атрымалася, што гаспадарка і зямля былі для яго даражэйшымі за Ганну..."

* * *

"Ці часта наведваўся Іван Паўлавіч у Глінішча, калі стаў ужо вядомым пісьменнікам?" — пытаюся ў Соф'і Піліпаўны. Яна шчыра адказвае, што было па-рознаму, часам мог наязджаць ці не кожны месяц, а іншым разам бацькам, сваякам і проста аднавяскоўцам даводзілася чакаць Івана Паўлавіча і год. Не трэба забываць, што акрамя творчасці пісьменнік вымушаны быў шмат шчыраваць на грамадскай ніве: быў старшынёй праўлення таварыства "СССР — Францыя", старшынёй Беларускага камітэта абароны міру, сябрам Сусветнага Савета Міру. Шмат нерваў забіралі і афіцыйныя пасады: у апараце ЦК КП(б)Б, а пасля — у апараце Саюза пісьменнікаў Беларусі (з 1966 года працаваў там сакратаром, з 1971 па 1976 год — намеснікам старшыні праўлення). Але галоўнае, кажа Соф'я Піліпаўна, Іван Паўлавіч вельмі цяжка хварэў. "Колькі жыў ён, столькі і хварэў. Раненні адгукапіся. Ныркі балелі, лёгкія..."

Соф'я Піліпаўна расказала пра два выпадкі з апошняга года жыцця Івана Мележа, якія шмат чаго гавораць аб тым, як ставіўся ён да людзей і як ставіліся да яго людзі.

Першы выпадак. Люты 1976 года. Шэсць месяцаў да смерці. Іван Паўлавіч мусіў адзначаць сваё 55-годдзе. Менавіта мусіў, бо, напэўна, не да юбілеяў яму ўжо тады было — у вочы зазірала блізкая смерць. Можна толькі здагадвацца, каго ён больш за ўсё хацеў бы бачыць на сваім апошнім юбілейным вечары ў Купалаўскім тэатры. Вядома ж, сваіх блізкіх, землякоў, тых, каму прысвяціў сваю творчасць, каго навек уславіў сваёй "хронікай"... І якую ж радасць адчуў Іван Паўлавіч, калі літаральна за дзень да вечара даведаўся, што глінішчанскі самадзейны жаночы хор надумаў зрабіць яму сюрпрыз — прыехаць у Мінск, каб праспяваць для яго ягоную любімую песню "У канцы грэблі шумяць вербы"! Ён бы тады, дарэчы, і не даведаўся б пра гэта напярэдадні, а атрымаў бы сапраўдны сюрпрыз, але па дарозе з Глінішча ў Мінск аўтобус, на якім ехалі жанчыны, зламаўся, яго доўга рамантавалі, і спявачкі спазніліся на сваю бронь у сталічнай гасцініцы — у нумары, прызначаныя для іх, паспелі ўжо засяліць іншых людзей. Пра гэта і паведамілі ў той жа вечар Івану Паўлавічу, і той хуценька паруліўся аб тым, каб жанчын усё-такі пасялілі...

А назаўтра быў вечар. І гучалі са сцэны "Вербы". І ледзь не плакаў, слухаючы сваіх зямлячак, пісьменнік. І запрасіў ён тых жанчын потым на банкет разам з высокімі гасцямі, вядомымі пісьменнікамі. І не зводзіў з іх увесь вечар сваіх, ужо ўпалых ад смяротнай хваробы, вачэй...

Тыя жанчыны, дарэчы, і сёння амаль усе жывуць. Толькі хору ў Глінішчы ўжо няма.

І другі выпадак. Май 1976 года.Тры месяцы да смерці. Поўным ходам ідзе падрыхтоўка да VII з'езда Саюза пісьменнікаў Беларусі. Іван Паўлавіч доўга адмаўляўся ад выступлення, нават ад прысутнасці на з'ездзе. Але ж які з'езд без выступлення намесніка старшыні праўлення? І зноў пагадзіўся, і зноў пайшоў насустрач людзям, якія яго прасілі. Сабраўся з сіламі, выступіў, як заўсёды, прыгожа і мудра ў прысутнасці ўсёй вялікай пісьменніцкай грамады і Машэрава.

А пасля таго, як з'езд скончыўся, дзесяць пісьменнікаў, у тым ліку, канечне, і Мележ, атрымалі ад Пятра Міронавіча нечаканае запрашэнне праляцець разам з ім на верталёце над Палессем і паглядзець на яго з вышыні птушынага палёту. Ну што ж, на верталёце з Машэравым — дык на верталёце. Якраз ішла пасяўная, і кіраўніка рэспублікі можна было зразумець. Ніхто тады і не здагадваўся, які сюрпрыз падрыхтаваў Івану Паўлавічу Пётр Міронавіч. Ды толькі калі верталёт даляцеў да Палесся і пачаў нізка кружыць над Хойніччынай, у салон зайшоў пілот і звярнуўся да Івана Паўлавіча: "Пакажыце, калі ласка, дзе ваша Глінішча...".

Верталёт з Машэравым і пісьменнікамі прызямліўся на школьным стадыёне. Выбеглі дзеці,

настаўнікі, пацягнуліся людзі з усіх канцоў вёскі. "Я сама бегла туды, спатыкаючыся, — успамінае Соф'я Піліпаўна. — Памятаю, выйшаў Шамякін і гаворыць школьнікам: "Дзеці, а вы ведаеце, хто да вас прыляцеў? Гэта ваш зямляк, пісьменнік Іван Мележ, а гэта — наш кіраўнік Пётр Машэраў". Гэта было нешта нечуванае, каб верталёт з кіраўніком рэспублікі без усялякага папярэджання прызямліўся на звычайным стадыёне вясковай школы. Са школы тады званілі ў райкам партыі, маўляў, у нас Машэраў з пісьменнікамі, дык там не паверылі, пакруцілі пальцам ля скроні... А трэба, сапраўды, аддаць належнае Пятру Міронавічу. Ён жа ўсё выдатна ведаў пра Івана Паўлавіча, пра яго невылечную хваробу і блізкі канец. Спецыяльна кансультаваўся перад гэтым з міністрам аховы здароўя Саўчанкам, у якога назіраўся Мележ. І вось вырашыў зрабіць для Івана Паўлавіча такі падарунак, каб ён у апошні раз сустрэўся з землякамі, пагутарыў з імі".

Тады, у маі 1976 года, пісьменнік, сапраўды, апошні раз ступіў на родную глінішчанскую зямлю. Яго пахавалі ў жніўні на Маскоўскіх могілках у Мінску.

Шчыра кажучы, пасля гэтых расповедаў Соф'і Піліпаўны Ліпніцкай я расчуліўся ледзьве не да слёз і папрасіў яе, нарэшце, правесці мяне па музеі. Дыхтоўная экспазіцыя таксама расказвае пра многае, а калі коратка, па-школьнаму, — то пра жыццё і творчасць народнага пісьменніка Беларусі Івана Паўлавіча Мележа. Тут можна быццам апынуцца ў ягоным рабочым кабінеце з тымі ж крэсламі, пісьмовым сталом з арыгіналам-рукапісам "Людзей на балоце". Тут можна ўбачыць яго асабістыя рэчы і шчыра здзіўляцца з даволі сціпленькага гадзінніка і гарнітура. Кажучы каламбурам, пра многае сведчаць ягоныя шматлікія пасведчанні: дэпутата, сябра Саюза пісьменнікаў, лаўрэата Ленінскай прэміі... Аб шырыні вядомасці Мележа ў свеце гавораць ягоныя кнігі на шматлікіх замежных мовах. І, безумоўна, фотаздымкі, фотаздымкі, фотаздымкі — сямейныя, франтавыя, пісьменніцкія...



Дарагія сябры!

З вялікай цікавасцю азнаёміўся з экспазіцыяй вашага музея, прысвечанага жыццю і творчасці народнага пісьменніка Беларусі Івана Паўлавіча Мележа.

Гэты знакаміты сын Гомельскай зямлі сваім выдатным талентам уславіў Беларусь, унёс важкі ўклад у развіццё айчыннай і сусветнай літаратуры. Кнігі Івана Мележа сталі сапраўднай нацыянальнай эпапеяй, энцыклапедыяй народнага жыцця, крыніцай выхавання патрыятызму і любові да роднай мовы, гісторыі і культуры нашай Бацькаўшчыны.

Вельмі прыемна што тут, на малой радзіме Івана Мележа, так уважліва захоўваецца памяць аб ім. Наведванне музея ў вёсцы Глінішча дапамагае спасцігнуць вытокі творчага натхнення пісьменніка, адчуць яго непарыўную сувязь з вясковымі каранямі.

Жадаю ўсім супрацоўнікам і наведвальнікам музея добрага здароўя, шчасця і поспехаў у працы на карысць любімай Беларусі.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка

26 красавіка 2008 г.

У 2008 годзе Дом-музей народнага пісьменніка Беларусі І.П. Мележа наведаў кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка. Агледзеў экспазіцыю, пагаварыў з Соф'яй Піліпаўнай даўжэй, чым гэта было прадугледжана пратаколам, пакінуў свой запіс у кнізе водгукаў для шаноўных наведвальнікаў (гэты запіс вы можаце прачытаць на фота).

Наогул жа, сёння ў мележаўскім музеі вядуць ужо чацвёртую па ліку кнігу водгукаў. Па словах дырэктара, штогод музей наведваюць каля тысячы чалавек. Часцей, безумоўна, школьная і студэнцкая моладзь (дарэчы, як завядзёнка — першы ўрок па творчасці Мележа ў школьнікаў Глінішча і суседніх вёсак абавязкова праходзіць менавіта тут). Але прыязджаюць сюды не толькі тыя, хто вывучае Мележа. Літаральна за апошнія некалькі тыдняў у музеі пабывалі дзве вялікія дэлегацыі — 45 супрацоўнікаў Барысаўскага завода медпрэпаратаў і 20 работнікаў Белпрамбудбанка. Здараецца, што завітваюць зусім нечаканыя наведвальнікі. Так, нядаўна музей наведаў немец, грамадзянін ФРГ, які, як высветлілася, быў у Беларусі па справах, але не мог не заехаць у Глінішча, бо Іван Мележ — адзін з яго любімых пісьменнікаў.

А летась мележаўскі дом наведала адна сям'я з Магілёва — ён, яна і дачка-студэнтка. Бацькі адразу ж накіраваліся аглядаць экспазіцыю, а дачка заўпарцілася, вырашыла пачакаць у машыне. (Маўляў, што я там даведаюся новага? Біяграфію Мележа мы і так праходзілі ў школе.) Але бацькоў дзяўчыне давялося чакаць занадта доўга, і неўзабаве яна таксама зайшла ў музей. А як зайшла, дык і правяла там ці не з гадзіну за гутаркай з Соф'яй Піліпаўнай. "Мы, вось як з вамі, з ёй гаварылі пра ўсё-пра ўсё, — заўважыла дырэктар. — А потым мы аднойчы адкрылі пошту, а там — артыкул у нейкай універсітэцкай газеце пра наш музей за подпісам гэтай дзяўчыны".

Падзякаваўшы Соф'і Піліпаўне і за гутарку, і за экскурсію па экспазіцыі, я ўжо збіраўся развітацца, аднак яна мяне прыпыніла: "Пачакайце яшчэ пяць хвілінак, я нешта вам пакажу". І ўставіла ў камп'ютар дыск. Неўзабаве паявілася карцінка і пачуўся голас. Я адразу зразумеў, што гэта якраз тое, адно з апошніх прылюдных выступленняў Івана Паўлавіча на ягоным юбілейным вечары ў 1976 годзе, калі павіншаваць яго і праспяваць для яго песню "У канцы грэблі шумяць вербы" прыехаў глінішчанскі хор. Калі запіс скончыўся, я папрасіў Соф'ю Піліпаўну запусціць яго зноў, а сам тым часам уключыў дыктафон. Мне здалося, што ў той апошні свой святочны вечар Іван Паўлавіч сказаў нешта

вельмі важнае. Вось тыя яго словы, знятыя з дыктафона. Фактычна я нічога не папраўляў, бо грэшна правіць нават вусную мову вялікага пісьменніка.

"Вы ж зразумейце, што адна сустрэча з маімі землякамі, з глінішчанцамі — гэта для мяне вялікае хваляванне. Таму што калі я гляджу на гэтых маіх зямлячак, на дзяўчат, на жанчын больш сталага веку, то ўспамінаю вельмі многае такое... Столькі ў маё сэрца ўрываецца, што пра гэта не расказаць за ўсё жыццё. І я адчуваю, што тымі сваімі кніжкамі, якія вы ведаеце, я расказаў толькі адну, можа быць, сотую, а можа быць, не адну сотую, а адну тысячную таго, што я перажыў, што бачыў у жыцці і што адчувае маё сэрца. Я думаю, якімі б мы былі сапраўды харошымі пісьменнікамі, калі б маглі перадаць чалавечымі словамі тое, што ўмее адчуваць наша сэрца! Якімі б мы былі пісьменнікамі!.. Я, слухаючы выступленні, гледзячы ўрыўкі, больш за ўсё думаў не аб тым, што зрабіў, а аб тым, што страціў, аб тым, што я не ўправіўся і не змог зрабіць з прычыны абмежаванасці свайго таленту, з прычыны абмежаванасці ў сваім здароўі, якое даволі-такі моцна падарвала вайна. Дарагія таварышы, літаратура — такая штука, якая асабліва мае патрэбу ў цяпле, у ласцы чалавечай, у сонцы. І я бясконца рады ўсім вам, каторыя прыйшлі на гэтую сустрэчу. І цяпло гэтай сустрэчы, такой нечаканай, такой хвалюючай для мяне, будзе грэць маё сэрца ўсё жыццё да апошніх маіх дзён. І літаратура такая рэч, пра якую можна, як і пра жанчыну, калі перафразаваць, гаварыць бясконца. Я мог бы пра літаратуру гаварыць бясконца, таму што я ёй жыву ўжо многія гады, і яна такая, што многа вельмі самых розных адценняў і многа розных эмоцый пакідае ў душы. Але мне хочацца сказаць толькі пра адно — пра тое, што калі мы што-небудзь і зрабілі ў літаратуры, дык гэта таму, што ёсць сэрцы, ёсць цеплыня чалавечых сэрцаў, ёсць чалавечыя погляды, якія грэюць вось у часе такіх сустрэч. І адзінае, што мне хочацца сказаць на гэтай сустрэчы, — дык гэта словы вялікай падзякі ўсім, хто выступіў. І асаблівая падзяка — канечне, не пакрыўдзіцеся, — я думаю, тым землякам, якія прыехалі за 400 кіламетраў, каб памагчы свайму земляку вытрымаць экзамен перад патрабавальнымі мінчанамі".


Дырэктар Глінішчанскага ВПК імя Мележа Г.А.Васяновіч.

У Глінішчы мяне чакала яшчэ адна захапляльная экскурсія — па Глінішчанскім вучэбна-педагагічным комплексе "дзіцячы сад — сярэдняя школа" імя І.П. Мележа. Правяла яе дырэктар установы Галіна Анатольеўна Васяновіч. Бязмежна радавала вока ўсё, што я там пабачыў: утульныя пакоі і пакойчыкі ў асобным корпусе дзіцячага садка (ёсць нават адмысловы закуток для адпачынку дзіцяці, якое хоча пабыць адно), багацце метадычнага абсталявання і развіццёвых цацак, дагледжаны аптэкарскі агарод з 19-цю відамі лекавых раслін, з густам аформленыя аўдыторыі ў будынку сярэдняй школы, адмысловая фотавыстава "Эпізоды з жыцця Івана Мележа" ў калідоры, іншыя тэматычныя мележаўскія стэнды. А калі на прышкольным падворку мне паказалі стылізаваную кампазіцыю з глінішчанскай хатай на палях у балоце, калодзежам, возам, прадметамі сялянскага побыту, маё сэрца літаральна замерла ад захаплення.


Усё як у рамане пісьменніка. Не хапае толькі самых людзей на балоце...

Такога я, сапраўды, яшчэ ніколі не бачыў. Усё, як у рамане Івана Мележа. Ёсць тут нават старая "груша" (насамрэч вішня, і зусім не старая), ля якой сустракаліся Васіль і Ганна. І нават адмысловая гаць з бярозавых канчуроў, якую талакой клалі некалі мележаўскія палешукі...



Гэтая прышкольная экспазіцыя, дарэчы, таксама стваралася талакой: настаўнікамі (асабліва пашчыраваў выкладчык працоўнага навучання Валянцін Міхасёў), вучнямі і бацькамі.

Падумалася, што гэта сапраўдны філіял Дома-музея Мележа пад адкрытым небам. Падумалася і сказалася: "Дзякуй вам, Галіна Анатольеўна, усёй вашай школьнай грамадзе за тое, што так адметна і шчыра вы шануеце памяць Івана Паўлавіча, рупіцеся аб тым, каб глінішчанскія дзеці ўжо з самых малых гадоў ведалі і ганарыліся, хто яны і адкуль!"